ISSN 1609-9672

# ИЗВЕСТИЯ

## Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины

**№ 1(64)**

*Социально-экономические и общественные науки*

2011

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №1(64), 2011

УДК 37.01(476):17

# Рэлігійны аспект генезісу этыка-педагагічнай думкі Беларусі

В.С. Болбас

В статье проанализированы основные этико-религиозные идеи. Они были распространены на территории Беларуси в древние и средние века и предопределили направление развития теории и практики нравственноговоспитания. Наблюдается влияние язычества, христианства и поликонфессиональных факторов на формирование этико-педагогических идей.
**Ключевые слова:** этыка-педагагічная думка, маральны патэнцыял рэлігіі, маральнае выхаванне, духоўнасць, хрысціянская этыка, рэлігійна-маральныя ідэі, маральна-духоўныя каштойнасці.

The main ethic-religious ideas are analyzed in this work. They were spread on the Belarusian lands in ancient and middle ages, and they predetermined the direction of native theory and practice of moral education. The influence of the heathenism, Christianity and polyconfessional factor on the ethic-pedagogical thought forming in Belarus is observed.
**Keywords:** ethic-pedagogical thought, religion moral potential, moral education, spirituality, Christian ethics, religious and moral ideas, moral and cultural values.

## Уводзіны

*Сёння аксіяматычна гучыць сцвярджэнне аб істотнай ролі рэлігіі ў маральна-духоўным развіцці асобы і грамадства. Між тым, у папярэдні перыяд “барацьбы з антынавуковым светаўспрыманнем” мы не толькі страцілі найважнейшы сродак маральнага выхавання, а нават пакінулі па-за ўвагай сам падмурак, аснову, на якой фарміравалася любая этыка-педагагічная ідэя апошніх двзюх тысяч гадоў. Таксама відавочна, што, не ведаючы вытокаў развіцця той ці іншай тэорыі, практычна немагчыма дабіцца яе перспектыўнага развіцця. Вывучаючы генезіс этычнай думкі Беларусі, многія айчынныя філосафы (А. С. Майхровіч, С. А. Падокшын, У. М. Конан, Э. К. Дарашэвіч і інш.) разглядалі пэўныя аспекты гэтай праблемы. З пазіцыі ж гісторыка-педагагічнай навукі падобнага даследавання пакуль што не праводзілася.*

## Вынікі даследавання

Рэлігія і мараль утвараюць два магутныя пласты духоўнай культуры. Маральны патэнцыял рэлігіі з яго верай у перамогу дабра і справядлівасці фарміраваў многія правілы і нормы зямнога суіснавання людзей. Пачынаючы з глыбокай старажытнасці, рэлігійная этыка выпрацоўвала маральныя каштоўнасці, якія вызначалі шматлікія бакі жыцця, у тым ліку, і пытанні выхавання.

Агульнавядома, што ва ўсіх першабытных народаў існаваў свой уклад жыцця, свая мараль у выглядзе бытавых правіл, якія з’явіліся на самых ранніх этапах развіцця чалавецтва. Яны ўстанаўлівалі парадак карыстання тым, што належала ўсяму роду, рэгулявалі адносіны паміж членамі абшчыны, абумоўлівалі паводзіны ў пэўных сітуацыях і, такім чынам, дапамагалі арганізацыі супольнага жыцця. Пазней з’яўляецца асобны напрамак прадпісанняў, звязаных з рэлігійнымі ўяўленнямі нашых продкаў. Фарміруецца звод нормаў і правіл жыцця, заснаваны на веры, які ў многім вызначаў характар паводзін у грамадстве. З цягам часу рэлігійнае настолькі пераплялося з іншымі духоўнымі каштоўнасцямі, што зараз часта аб’ядноўваецца ў панццце “народнае”.

На тэрыторыі Беларусі таксама першапачаткова складвалася свая сістэма вераванняў і звычаяў, якая атрымала назву язычніцтва. Вывучаючы вераванні ўсходніх славян, гісторык С. Салаўёў робіць вывад: “Религія эта состояла, во первыхъ, въ поклоненіи стихійнымъ бо-

жествамъ, во вторыхъ, въ поклоненіи душамъ умершихъ, которое условливалось родовымъ бытомъ, и изъ котораго преимущественно развилась вся Словянская демонологія" [1, с. 53]. Прычым трэба мець на ўвазе, што, як слушна адзначае С. П. Жлоба, гэтая рэлігія "выконвае ролю сістэмы, якая апраўдвае, асвятляе і захоўвае нормы маралі, а таксама з'яўляецца інструментам узнаўлення маралі і маральнасці ў пакаленнях" [2, с. 75].

Многія бачаць у язычніцтве велізарны комплекс першабытных вераванняў, поглядаў і абрадаў, што складваліся на працягу многіх тысячагоддзяў і якія сталі асновай для фарміравання ўсіх сусветных рэлігій. Старажытная рэлігія ўсходніх славян адпавядала грамадскім умовам кааператыўнай ці калектыўнай вытворчасці і пэўнага ладу жыцця. Паняцце асобы, яе каштоўнасці не існавала. Кожны чалавек разглядаўся як член супольнасці, грамадзянін.

Ва ўсходніх славян, як і ў іншых народаў, сістэма правіл супольнага жыцця насіла прадпісальны характар і была цесна звязана з абраднасцю, з шанаваннем звышнатуральных сіл. Практычна для ўсіх і кожнага былі ўстаноўлены досыць строгія рамкі паводзін шляхам разнастайных табу і забарон.

Ужо ў гэты перыяд нашымі продкамі выпрацоўваюцца адпаведныя формы паводзін, у межах якіх індывід мог рабіць самастойныя ўчынкі, але з досыць падрабязнай рэгламентацыяй сваіх дзеянняў. Падобныя прадпісанні, характэрныя і для іншых народаў, утваралі, як іх цяпер называюць, першасныя асновы маральнасці. Сярод найважнейшых з іх – забарона забойстваў, шанаванне багоў, бацькоў, старэйшых, захаванне традыцый і г. д. Вельмі важны вывад робіць Б. А. Рыбакоў пры аналізе этапаў развіцця язычніцтва. Ён сцвярджае, што эвалюцыя язычніцтва мае своеасаблівы характар: тут новае не выцясняе старое, а наслойваецца на яго, дабаўляецца да існуючага [3, с. 4].

Развіццё феадальных адносін не магла задаволіць язычніцкая стракатасць міфалагічнага светаўспрымання, таму, дзякуючы многім абставінам, на ўсходнеславянскіх землях пачала ўсталёўвацца хрысціянская рэлігія. Даследчыкі адзначаюць, што ўжо ў IX ст. на беларускіх землях з'яўляюцца хрысціянскія місіянеры. У IX-X стст. хрысціянства напачатку актыўна ўкаранялася ў княжацкіх дварах сярод дружыннікаў і купцоў. У XI ст. яно ахапіла гарады. І ўжо з XII ст. распаўсюджваецца сярод шырокіх народных мас у вёсцы [3, с. 19]. Трэба адзначыць, што хрысціянства выцесніла з народнага светапогляду не ўсе народныя язычніцкія вераванні. У беларусаў, як і ў іншых усходніх славян, да сучаснасці захаваліся элементы язычніцкай веры, асобныя абрады, рытуалы і т. п. Міфалагічная свядомасць, якая развівалася тысячагоддзямі, і сёння ўплывае на фарміраванне маральных ідэалаў і маральных паводзін. Пры разглядзе раннесярэдневяковага перыяду ва ўсходніх славян, многія схіляюцца да думкі аб немагчымасці адназначна сцвярджаць, што ў той час вызначала светапогляд народу – хрысціянства ці язычніцтва [3, с. 21]. У свой час Фядосій Пячэрскі пісаў: "Мы только словомъ нарицаемся христіане, а погански живемъ" [5, с. 243]. Значна выражаная язычніцкая афарбоўка менталітэту беларусаў тлумачыцца яшчэ і тым, што ў часы панавання хрысціянства даваў аб сабе знаць уплыў сумежнага балтыйскага насельніцтва, што да XIV ст. заставалася язычніцкім і з часткай якога беларусы працяглы час знаходзіліся ў адной дзяржаве.

Хрысціянства было вымушана "ўспрыняць, пераўтварыць і нават развіць асобныя элементы культаў і частку абраднасці старой рэлігіі" [4, с. 243]. У значнай ступені апора на каштоўнасці духоўнай культуры народа дапамагла хрысціянству ў асноўным негвалтоўна распаўсюдзіцца на ўсходнеславянскіх землях. Пад уздзеяннем язычніцтва на землях нашых продкаў само хрысціянства становіцца больш "мірскім", "абрадавым". Сучасны расійскі філосаф А. Ф. Замалееў падкрэслівае, што, канстатуючы захаванне славянскага язычніцтва пасля хрысціянізацыі ўсходніх славян, патрэбна ў гэтым бачыць не звычайнае "двоеверие", а светапоглядны сінкрэтызм, зліццё народнай і хрысціянскай рэлігіі [6, с. 9-18]. "Засвойваючы хрысціянства па знешнасці, – пісаў У. Пічэта, – народныя масы засталіся вернымі традыцыям язычніцтва. Яно жыве ў глыбіні свядомасці народа; само хрысціянства аб'ядноўваецца, прыстасоўваецца да простага светаразумення" [7, с. 11]. Усё гэта дае падставы сцвярджаць, што пісьменнасць, летапісанне, асвета і педагагічная думка ўсходніх славян маюць сваю ўласную аснову, а хрысціянства надало істотны дынамізм развіццю гэтых працэсаў і прынес-

ла з сабой новыя элементы, якія прыжыліся толькі дзякуючы адпаведнаму ўзроўню развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры нашых продкаў. Больш таго, маюць рацыю навукоўцы, якія разглядаюць язычніцтва «як фактар аховы этнакультурнага фонду ўсходнеславянскіх народаў ад яго размывання пад уплывам знешніх фактараў, галоўным чынам, хрысціянскай рэлігіі» [7, с. 11].

Яшчэ адной адметнасцю распаўсюджвання хрысціянства на беларускіх землях было тое, што "культура старажытнай Беларусі перыяду XI–XIII стст., у цэлым зарыентаваная на Візантыю, была адкрыта для ўспрымання навацый з іншых рэгіёнаў, асабліва з Цэнтральнай і Заходняй Еўропы" [8, с. 363]. Менавіта гэта прывяло да фарміравання шматканфесійнасці, якая адыграла істотную ролю ў духоўным жыцці грамадства і вызначыла шэраг адметнасцей у распрацоўцы ідэй маральнага выхавання. Поспех распаўсюджвання хрысціянскіх ідэй на беларускіх землях быў настолькі значным, што ўжо ў XII ст. тут з'яўляюцца такія магутныя духоўныя постаці, як Еўфрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі, Клімент Смаляціч і інш. Іх уплыў на развіццё айчынных ідэй маральна-духоўнага выхавання быў выключны. Увогуле нельга не пагадзіцца з думкай, што само хрысціянства як аснова сярэдневяковага светапогляду і ідэалогіі "было па сваёй сутнасці менавіта "педагагічным" рухам, пэўнай маральна-рэлігійнай школай чалавецтва" [9, с. 233].

У адрозненне ад язычніцкай рэлігіі, якая ў аснове была натуралістычнай, хрысціянства ўзнікла як рэлігія чалавека. У аснову светапоглядных уяўленняў хрысціянства быў пакладзены прынцып духоўна-маральнай каштоўнасці чалавека і пастаянная скіраванасць да агульнага дабра. Два вымярэнні чалавека (душа і цела) дапаўняюцца трэцім – "дух" (духоўнасць) – прыналежнасць да боскага праз веру. Згодна з хрысціянскім веравучэннем, падмуркам грамадскага ўладкавання павінна стаць высокамаральнае жыццё. Дамінантай паводзін чалавека, мэтай яго выхавання з'яўляецца маральнасць.

На думку У. М. Конана, менавіта ў перыяд ранняга хрысціянства тэарэтычна афармляюцца наступныя прынцыпы ўладкавання грамадскага супольнага жыцця: "а) усведамленне духоўнай свабоды як істотнай якасці чалавека, што адрознівае яго ад усіх іншых форм зямнога жыцця; б) апеляцыя да маральнай прыроды чалавека, да яго сумлення як вышэйшаму крытэрыю адносін паміж людзьмі; в) выпрацоўка паняцця чалавека як вышэйшай каштоўнасці, якая не залежыць ад яго нацыянальнай і сацыяльнай прыналежнасці" [10, с. 7].

Паводле хрысціянскіх уяўленняў чалавек ад нараджэння нясе на сабе цяжар першароднага граха, але ў яго ёсць адзіны шлях да ўратавання – маральнае ўдасканаленне. Важнейшым зыходным пунктам хрысціянскай этыкі з'яўляецца сцвярджэнне, што кожны чалавек можа радыкальна "змяніць сваю сутнасць". Зыходзячы з таго, што кожны індывід мае магчымасць не толькі выправіць дрэннае, а і палепшыць прыродна добрае, маральна-этычныя ідэі напаўняюцца духам аптымізму.

Беларускі філосаф А. С. Майхровіч падкрэсліваў: "Менавіта хрысціянства зацвердзіла саму ідэю ўдасканалення, развіцця чалавека і абставін яго жыцця, патрэбу і неабмежаванасць гэтага працэсу" [11, с. 19]. Згодна асноўных палажэнняў хрысціянскай этыкі, у кожнага ў зямным жыцці няма іншага праведнага шляху, як імкненне стаць чалавекам маральна-дасканалым. Хрысціянскае вучэнне, у першую чаргу, вызначалася маральнадыдактычным, павучальным, этыка-фармастваральным зместам. Вось чаму на працягу ўсяго перыяду сярэднявечча на беларускіх землях рэлігійна-маральныя ідэі займалі дамінуючае становішча. Ім падпарадкоўваліся агульнафіласофскія, эстэтычныя, палітычныя і нават эканамічныя праблемы таго часу. Прычым дзеячы грамадскай і педагагічнай думкі Беларусі ў пошуках маральна-духоўнага ўладкавання грамадства актыўна звярталіся да раннехрысціянскіх ідэй, якія мелі ярка выражаную дэмакратычную скіраванасць.

Асноўная мэта хрысціянскай этыкі – дасягненне ўсеагульнага дабра – магла ажыццявіцца толькі праз дабрачыннасць. Была распрацавана сістэма маральна-духоўных каштоўнасцей і Богачалавек вылучаўся ў якасці яе ўвасаблення. Дзякуючы такой арыентацыі на маральны абсалют, які натуральна ўспрымаецца чалавецтвам, хрысціянская этыка самым рашучым чынам уплывала на фарміраванне ідэй маральнага выхавання ў грамадстве. У яе ўяўленні быць чалавекам – гэта значыць жыць па запаветам Ісуса Хрыста. Праблема выхавання дабра ці скіравання выхаванцаў да дабра становіцца галоўнай і асноўнай праблемай выхавання наогул.

Важна адзначыць, што, адрозненне ад язычніцкага перыяду, калі паняцце дабра, маральнасці цалкам і поўнасцю вызначалася інтарэсамі канкрэтнай людской супольнасці, хрысціянская этыка акцэнтуе ўвагу на ўзвышэнні кожнага індывіда. Маральныя запаветы хрысціянства звернуты, перш за ўсё, да ўнутранага свету індывіда, да яго сумлення. Нават абмежавальны характар маральных нормаў уяўляе сабой, у першую чаргу, устанаўленне межаў уласных дум, помыслаў дзеянняў і ўчынкаў. Адносіны да іншых – гэта перш-наперш адносіны да самога сябе. Гэта стварае асновы для таго, каб, як і ў этычных вучэннях антычнасці, абсалютнае дабро і ўласнае шчасце зліваліся ў адзінае цэлае. Нормай і ўзорам адносін да бліжняга павінна была стаць любоў Бога да ўсіх людзей. Важна, што такая любоў распаўсюджваецца як на сваіх, так і на чужых. У адным з пастулатаў Евангелля непасрэдна сказана: "І калі вы вітаеце толькі братоў вашых, што асаблівага робіце? Ці не так паступаюць і язычнікі" [12, с. 47].

Хрысціянская любоў аб'яўляла поўную забарону на помсту, якая ўладарыла ў язычніцтве. Нават злыя думкі лічыліся грахоўнымі. Гэта быў прынцыпова новы падыход у арганізацыі супольнага жыцця і грамадскіх адносін. З любові выводзяцца такія якасці, як пакорлівасць, непрацыўленне злу, гвалтам, добразычлівасць, міласцівасць, гасціннасць і інш. Больш таго, чалавечыя якасці, якія грунтуюцца на любові істотна адрозніваюцца ад іншых, нават знешне падобных. Так, напрыклад, даследчыкі падкрэсліваюць, што трэба бачыць розніцу "паміж пакорлівасцю дзеля любові і пакорлівасцю дзеля ўласнага выратавання" [13, с. 20]. Пакорлівасць многімі трактуецца як праява баязлівасці, нерашучасці, бяздзейнасці. Але гэта зусім не так. На час свайго зараджэння хрысціянства мела на мэце радыкальна змяніць існаваўшую рэчаіснасць. Хрысціянскае веравучэнне заклікала да цярпення не дзеля таго, каб прыстасавацца да несправядлівасці, не дзеля таго, каб схіліцца перад злом, а каб "сваёй пакорлівасцю ўтаймаваць сканцэнтраванае па хрысціянскіх паняццях у чалавечай гордасці сусветнае зло, перамагчы яго маральна, духоўна" [13, с. 29]. Галоўным інструментам ачышчэння грамадства ад злосці і нянавісці бачылася любоў.

Хрысціянская этыка прапануе новае разуменне справядлівасці, якая павінна ляжаць у аснове грамадскіх адносін. У дахрысціянскай рэлігіі паняцце справядлівасці ўключала ў сябе прынцып эквівалентнасці дзеяння і дзеяння ў адказ, іншымі словамі, справядлівасць мела месца тады, калі за дабро плацяць раўназначным дабром, за зло – злом. Новая мараль будавалася на прынцыпова новых падыходах. Высокамаральны чалавек павінен рабіць дабро без усялякай думкі пра нейкую адплату за гэта.

Арыентацыя на новыя маральна-духоўныя каштоўнасці абумовіла рашучую змену мэт выхавання. У адрозненне ад выхаваўчых мэт іншых ідэалагічных плыняў і натуралістычнай этыкі, якія імкнуліся ўдасканаліць чалавека ў межах яго ўласных магчымасцей і здольнасцей, хрысціянства ставіць задачу радыкальна змяніць саму чалавечую сутнасць. Такія ўстаноўкі хрысціянскай этыкі стваралі маральны ідэал і для тых, хто імкнецца да яго цалкам, і для тых, хто хоча пазбавіцца ад асобных заганаў і набыць тыя або іншыя дабрачыннасці. З пункту гледжання хрысціянскай маралі чалавек з'яўляецца вобразам божым, а ў якасці маральнага ідэала выступае Ісус Хрыстос. Трэба прызнаць, што ідэал хрысціянства на многія стагоддзі вызначыў маральны ідэал педагагічнай думкі многіх народаў, у тым ліку і беларускага. Наогул хрысціянства дало пачатак усталяванню ўніверсалізму маральных патрабаванняў на аснове ўласнай дактрыны, што істотна адбілася на развіцці тэорыі маральнага выхавання. Па сутнасці, фарміравалася новая мараль, ядром якой з'ўлялася духоўна-маральная самакаштоўнасць чалавека і ідэя агульнага дабра, як перадумова існавання грамадства і яднання людзей [11, с. 7]. Дабро і доўг утваралі падмурак змястоўнага напаўнення тэорыі і практыкі маральнага выхавання. "Сама мараль і маральнасць наогул, – сцвярджае А. С. Майхровіч, – выступалі ў хрысціянскім жыццёвучэнні як сфера і форма праяўлення сапраўдных, адпавядаючых ідэі дабра і справядлівасці, нормаў і законаў чалавечага жыцця" [11, с.19].

Важнейшай асаблівасцю хрысціянскага выхавання быў яго наднацыянальны, агульначалавечы характар. Практычна ўпершыню ў гісторыі чалавецтва ставіліся аднолькавыя задачы маральнага ўдасканальвання абодвух палоў – мужчынскага і жаночага. Хрысціянства дало ступень святасці шлюбу, сям'я становіцца найважнейшай сацыяльнай ячэйкай грамадства. У адрозненне ад ветхазаветнай сям'і, дзе панаваў суровы патрыярхат з неабмежаванай ула-

дай гаспадара, хрысціянская будуецца на падмурку любві, узаемнай дапамогі, аднолькавай роўнасці і свабоды ўсіх членаў сям'і. Значна ўзрастае роля сям'і ў выхаванні дзяцей. Прынцыпова новае становішча ў гэтым працэсе займае жанчына, якая карыстаецца правамі жонкі і маці. Асноўным прынцыпам сямейнага выхавання Свяшчэннае пісанне аб'яўляе павагу да бацькоў. З іншага боку бацькі павінны глядзець на дзяцей як на божы падарунак і пастаянна клапаціцца аб іх выхаванні. Маральнае выхаванне прадугледжвала непасрэдна апору на ўнутраныя духоўныя якасці асобы.

Адной з асаблівасцей хрысціянскага выхавання была яго арганізацыя з улікам свабоды выбару кожнага індывіда. Праблема свабоды волі аказала сур'ёзны ўплыў на фарміраванне тэарэтычных асноў маральнага выхавання. Згодна асноўных палажэнняў хрысціянскага веравучэння, чалавек, дзякуючы свайму свядомаму, асабістаму пачатку ў маральна-духоўным плане, валодае свабодай выбару: быць добрым ці дрэнным. Такім чынам, свабода з'яўляецца абавязковай умовай адказнасці індывіда за свае паводзіны. Кожны чалавек абавязаны імкнуцца да развіцця ў сабе рыс і якасцей боскага вобразу. І хоць гэта ў многім адбываецца пад уздзеяннем знешніх умоў і фактараў, але іх уздзеянне магчыма толькі праз уключэнне самога індывіда ў гэты працэс. Таму роля індывіда ў асабістым маральна-духоўным удасканаленні не можа быць пасіўнай. Даследчык хрысціянства Д. Клеман якраз і лічыць самаўладдзе чалавека асноўнай умовай маральнага развіцця асобы [14, с. 157]. Свабода чалавека мае два ўзаемазвязаныя бакі. Па-першае, кожны чалавек можа самастойна асэнсаваць і вызначыць свае адносіны да тых ці іншых каштоўнасцей і, па-другое, можа самастойна прымаць рашэнні і здзяйсняць адпаведныя ўчынкі. У хрысціянстве маральна-свабодным лічыцца той чалавек, які выкарыстоўвае свабоду волі на карысць агульнаму дабру.

Складанасць праблемы часта заключаецца ў тым, што ў рэальным жыцці не заўсёды проста можна адрозніць дабро ад зла. З дапамогай пэўных ведаў, на аснове жыццёвага вопыту чалавек павінен сам вызначыцца ў сваім выбары. Задача ўскладняецца тым, што ў кожнай асобнай сітуацыі зло часта маскіруецца пад дабро. І калі ў якасці абсалютнага дабра можна ўказаць ідэальны ўзор паводзін, то для канкрэтных абставін даваліся досыць акрэсленыя арыенціры, не столькі дабра, колькі таго, што не з'яўляецца дабром, чаго трэба пазбягаць і што яму патрэбна супрацьпастаўляць. Не выпадкова, што шэраг амаральных рыс, якасцей і адпаведных дзеянняў адносіцца да грахоўных. Сярод іх: хлусня, паклёп, зайздрасць, гнеў, нарлівасць, насілле, крадзёж, распуста, сквапнасць, неміласэрнасць і інш.

Хрысціянская этыка вучыць, што не заўсёды дабрадзейная свядомасць увасабляецца ў дабрадзейных справах. Сапраўды высокамаральным чалавекам можа быць той, у каго кожны элемент маральнай свядомасці з'яўляецца асновай адпаведных учынкаў, а з іншага боку, кожны дабрадзейны ўчынак з'яўляецца вынікам сукупнай духоўнай вартасці асобы. Іншымі словамі, сама вера, маральнасць чалавека павінны мець дзейнасны характар.

А. Ф. Замалееў адзначае: "Пад уплывам язычніцкай этыкі старажытнарускі чалавек інакш асэнсоўвае і саму хрысціянскую набожнасць: набожным ён прызнае не таго, хто праводзіць жыццё ў пастах і малітвах, а таго, хто з'яўляецца дабрачынным у жыцці" [6, с.20]. Дзеля ўратавання недастаткова аднаго аскетычнага прытрымлівання запаветаў Хрыста, на першае месца вылучаецца грамадская значнасць менавіта дзеянняў, учынкаў чалавека, іх выніковасць. Характэрна і тое, што сапраўдны ўладальнік вышэйшых маральных якасцей не чакае ніякай узнагароды за свае дабрадзейныя справы і не здзяйсняе іх з-за страху перад адказнасцю ці пакараннем. Таму паводле хрысціянскіх перакананняў дабрадзейнасць толькі на пачатку яе фарміравання патрабуе значных намаганняў волі. Рухавіком жа маральнай дзейнасці, у першую чаргу, з'яўляюцца пачуцці, эмацыянальны бок духоўнага свету індывіда. Менавіта пагэтаму хрысціянскіх арганізатараў маральна-выхаваўчага працэсу пераважна вабілі эмацыянальныя аспекты педагагічнага ўздзеяння і з гэтай нагоды прыярытэтная ўвага надавалася выхаванню пачуццяў і душы.

Наогул, трэба адзначыць, што роля рэлігіі ў распрацоўцы мэт і зместу маральнага выхавання досыць значная, але яшчэ большая ў практычнай арганізацыі маральнага выхавання. Хрысціянскі запавет, па сутнасці агульначалавечы, пасля атрымання рэлігійнага абгрунтавання з дапамогай царквы, шматлікіх рытуалаў, абрадаў актыўна ўкараняецца ў свядомасць і практыку

грамадскіх адносін. Не выпадкова К. А. Гельвецый прыйшоў да слушнай высновы аб тым, што рэлігійная мараль "ёсць не што іншае, як удасканаленая чалавечая мараль" [15, с. 145].

Істотнай адметнасцю рэлігійных умоў развіцця ідэй маральнага выхавання ў Беларусі было існаванне некалькіх канфесійных плыняў. Беларусь знаходзілася ў самым цэнтры хрысціянскага свету, яна межавала з праваслаўным усходам, каталіцкім захадам і пратэстанцкай поўначчу. Само хрысціянства было прадстаўлена рознымі накірункамі: праваслаўем, каталіцтвам, пратэстантызмам, уніяцтвам, адгалінаваннем праваслаўя – стараабрадствам. Існавалі таксама аб'яднанні мусульман і іўдзеяў. Плюралізм рэлігійна-царкоўнага жыцця, які гістарычна склаўся на землях Вялікага княства Літоўскага, вымусіў дзяржаўныя ўлады на працягу XV – першай паловы XVI ст. прыняць шэраг прававых актаў, якія забяспечылі развіццё адноснай талерантнасці як на дзяржаўным, так і на грамадскім узроўні.

Суіснаванне на беларускіх землях хрысціянскай поліканфесійнасці і некаторых іншых рэлігійных веравучэнняў самым непасрэдным чынам садзейнічала актывізацыі тэарэтычных распрацовак і пошукаў практычных шляхоў у развіцці маральнага выхавання, істотным чынам пашырала крынічную базу айчыннай этыка-педагагічнай думкі. Кожная рэлігійная плынь у першую чаргу з дапамогай уласнай ідэалогіі імкнулася прыцягнуць на свой бок як мага больш вернікаў. Улічваючы тое, што ў часы сярэднявечча асноватворным вытокам грамадскага светапогляду была Біблія і яна ж з'яўлялася найважнейшай крыніцай развіцця ідэй маральна-духоўнага выхавання, прадстаўнікі розных канфесій імкнуліся выкарыстаць яе ў якасці сродку ўздзеяння на людзей. Царкоўныя іерархі ў самім Свяшчэнным пісанні знаходзілі самыя разнастайныя ідэі: ад разумення самакаштоўнасці чалавека і сацыяльнага пратэсту супраць несправядлівасці да рабскай цярплівасці, пакорлівасці і аскетычнага знішчэння і самазнішчэння чалавечай асобы, ад імкненняў пастаяннага развіцця і ўдасканалення грамадства да кансерватыўна-забарончых тэндэнцый "старадаўнасці не разбураць". Такім чынам, сама хрысціянская ідэалогія ўтрымлівала патэнцыяльныя магчымасці для фарміравання любых поглядаў: ад рэакцыйна-кансерватыўных да радыкальна-рэфарматарскіх.

Амаль да XVI ст. у Беларусі права тлумачэння біблейскіх пастулатаў мелі толькі прадстаўнікі афіцыйнай царквы. У пачатку XVI ст. слынны айчынны асветнік Францыск Скарына шляхам выдання Бібліі на роднай мове адкрывае магчымасць шырокім слаям насельніцтва, простым людзям самім, без пасрэдніцтва афіцыйнай царквы знаёміцца са зместам запаветаў хрысціянства. Прадоўжанае потым друкаванне кананізаваных кніг на роднай мове дало пэўны дынамізм і пашырыла магчымасці развіцця ў Беларусі этыка-педагагічнай думкі. Усё гэта ў сукупнасці з дэмакратычным характарам хрысціянства на Беларусі забяспечыла фарміраванне найважнейшай асаблівасці развіцця айчынных ідэй маральнага выхавання. У адрозненне ад краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, дзе гуманістычная плынь фарміравалася на досыць вузкім сацыяльным падмурку, які ўтваралі прадстаўнікі адукаванай вярхушкі грамадства, на беларускіх землях гуманістычна-педагагічныя ідэі па прычыне больш цеснай сувязі з рэлігіяй мелі яўна выражаны дэмакратычны характар і разам з ідэямі маральнага выхавання набылі агульначалавечую накіраванасць ідэі гуманістычнай педагогікі, у тым ліку і ідэі маральнага выхавання, якія з'явіліся на такой глебе, атрымалі выразна агульначалавечую накіраванасць.

А. Е. Лапцёнак пры даследаванні рэлігійнай маральнай спадчыны прыходзіць да высновы, што "праваслаўе, бадай, у большай ступені, чым заходняе адгалінаванне хрысціянства абапіраецца на розныя формы традыцыйнай культуры. Тут больш моцна гучаць матывы калектыўнасці, сабornасці" [2, с. 17]. Прынцып сабornасці, які культываваўся ў Візантыі, знайшоў спрыяльную глебу ва ўсходніх славян і ўдала дапасаваўся да існаваўшага тут жыццёвага ўкладу з сфарміраванымі маральнымі нормамі і паняццямі. Сама сабornасць азначае яднанне людзей на аснове любові да Бога і прыярытэтнасці маральных каштоўнасцей. В. Г. Крынчук не без падстаў адзначае, што незаслужана забытай аказалася праваслаўная працоўная этыка, бо на землях айчыны станаўленне хрысціянства ў многім адбывалася праз сялянства. Пад уплывам праваслаўя сфарміраваліся адносіны да працы як маральна неабходныя. "Таму і аснову этыкі сялянскай абшчыны складалі не толькі ўраўняльныя традыцыі, а і звычаі і нормы працоўнага права" [16, с. 39], – заключае вучоны. Так, напрыклад, дастатак, нажыты

сумленнай працай, паважаўся ў грамадстве. Пад непасрэдным уплывам праваслаўя ў змест маральнага выхавання актыўна ўкараняліся шанаванне традыцый, нацыянальны патрыятызм і дэмакратызм. Выразная акцэнтацыя лацінскай культуры на персаналістычныя вартасці, што настойліва праводзілася ў жыццё католікамі і пратэстантамі, спрыяла развіццю суб'ектывізацыі асобы, фарміраванню індывідуалістычных пазіцый. Так, Э. Яленская сцвярджае, што пратэстантызм сфарміраваў моцную сістэму індывідуальных правоў, якія грунтаваліся на этыцы, папулярызаванай духавенствам [17, с. 276]. Каталіцызм, а потым і пратэстантызм з уласцівай ім арыентацыяй на індывідуалізм садзейнічалі фарміраванню актыўнай, дзейнаснай асобы. Адданасць ідэям, індывідуальны падыход, імкненне да класічнай культуры і адукацыі былі пад асобым акцэнтам у каталікоў. Рэлігійная і этычная каштоўнасць працы, крытыцызм мыслення ўздымаюцца на значныя вяршыні ў пратэстантаў. Усё гэта непасрэдна ўплывала на распрацоўку тэарэтычных асноў маральнага выхавання.

У Беларусі атрымалі распаўсюджанне такія рэфармацыйныя плыні, як кальвінізм, лютэранства, цвінгліянства, веравызначэнні чэшскіх братоў і антытрынітарыяў. У процівагу артадоксам хрысціянскай веры, якія сцвярджалі, што чалавек можа ўратавацца толькі шляхам выканання царкоўных прадпісанняў, пратэстанты тлумачылі, што Усявышні бескарысна даруе ўратаванне людзям, а да веры і маральнасці яны прыходзяць у выніку ўласных намаганняў, без пасрэдніцтва афіцыйнай царквы. Пратэстанцкая мараль – у многім пурытанская мараль. Яна грунтуецца на перакананні аб першапачатковай грахоўнасці чалавека і неабходнасці яе збавення шчырым працалюбствам і праведнасцю. Такія падыходы непасрэдна і вынікова стымулявалі чалавечую актыўнасць у зямным жыцці.

Дзякуючы пратэстантызму грунтоўнаму перагляду быў падвержаны светапогляд самых шырокіх слаёў насельніцтва. Адбываецца рашучы паварот ад бязмежнай веры да сумнення і ад яго – да чалавечага розуму. Найважнейшы з пастулатаў радыкальнага крыла Рэфармацыі на беларускіх землях фармуляваўся наступным чынам: "Чалавек не павінен верыць у праўдзівасць таго, што розум з відавочнасцю вызначае як хлусню" [18, с. 52]. Такім чынам, істотны дынамізм набіраў працэс секулярызацыі этыкі. Маральныя каштоўнасці, якія, згодна рэлігійных канонаў, мелі незямное паходжанне, ачалавечваліся, звязваліся з канкрэтнай сацыякультурнай сітуацыяй. Як падкрэсліваецца сучаснымі даследчыкамі, "мараль часта вызвалялася ад рэлігійных догмаў у рамках самой рэлігіі" [19, с. 88].

Наогул, у этыцы рэфарматараў найважнейшае месца займала палажэнне аб асабістай адказнасці кожнага чалавека перад Богам без пасрэдніцтва афіцыйнай царквы, а маральна-этычная канцэпцыя антытрынітарыяў, якая мела ярка выражаную сацыяльную накіраванасць, нараджала крытыку маральных заганаў феадалізму і грамадзянскай няроўнасці, вызначала смелыя па задуме, але ўтапічныя па ажыццяўленню шляхі справядлівага ўладкавання грамадства.

Ерэтычны рух сярэднявечча, актывізацыя вальнадумства і рацыяналізм эпохі Адраджэння садзейнічалі з'яўленню на беларускіх землях атэістычных ідэй. Ужо з XVI ст. на Беларусі заяўляюць аб сабе прадстаўнікі ваяўнічага атэізму. Стэфан Лован, Каспар Бекеш, Казімір Лышчынскі і іншыя зрабілі рашучы крок у напрамку секулярызацыі этыкі і ажыццяўлення маральнага выхавання на свецкіх пачатках. Важна адзначыць, што грамадскія, педагагічныя і нават многія рэлігійныя дзеячы спрабавалі сумясціць рэлігійныя і свецкія асновы духоўнага жыцця, таму ў цэнтр сваіх светапоглядных сістэм змяшчалі этычны кампанент. Не выпадкова сучасныя даследчыкі адзначаюць, што асаблівасцю найважнейшых выхаваўчых задач педагагічнай думкі Беларусі "з'яўляецца арыентацыя на маральна-грамадзянскае ўдасканаленне чалавека, хоць вялікая ўвага адводзіцца развіццю інтэлектуальна-пазнавальных здольнасцей" [20, с. 44]. Рашучы крок у гэтым напрамку быў зроблены дзяржавай у канцы XVIII ст., калі прымаюцца пастановы аб размежаванні навукі і рэлігіі, асветы і царквы.

Трэба адзначыць, што распаўсюджанне маральна-духоўных каштоўнасцей хрысціянства ішло ў двух асноўных напрамках. Першы ўяўляў сабой далучэнне да хрысціянскіх цнот і запаведзей прадстаўнікоў афіцыйнай царквы, найбольш актыўных прыхажан і інш. Тут пытанні маральнага выхавання як мага цясней і непасрэдна ўвязваюцца з Запаветам Божым. Яны часта адрываюцца ад жыццёвых рэалій, ігнаруюць нацыянальна-культурны фактар, але

ў многім скіраваны да агульначалавечага ідэалу. Другі напрамак ахоплівае значную частку грамадства, якая лічыць сябе вернікамі. Яго прадстаўнікі ўяўляюць асноўныя пастулаты хрысціянскай этыкі як даволі аддаленыя ідэалы, якія тым не менш істотна ўплываюць на маральнае выхаванне сярод гэтай часткі насельніцтва. Прама і ўскосна ў гэты напрамак часта, але ў рознай ступені, уцягваецца і астатняя частка грамадства.

## Заключэнне

Такім чынам, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што ўплыў рэлігійнай этыкі на развіццё тэарэтычных і практычных асноў маральнага выхавання на беларускіх землях у многіх адносінах меў вызначальны характар і садзейнічаў распрацоўцы і ўсталяванню агульначалавечых падыходаў пры вырашэнні праблемы маральна-духоўнага ўдасканалення асобы і грамадства. У аснову развіцця айчыннай этыка-педагагічнай думкі былі закладзены наступныя прынцыпы: прыярытэтнасць маральнага выхавання ў агульным развіцці асобы, імкненне да ўсеагульнага дабра, прадстаўленне кожнаму індывіду свабоды волі, пабудова людскіх узаемаадносін на любові, талерантнасць у шырокім сэнсе слова і пераемнасць з апорай на традыцыяналізм.

## Літаратура

1. Архивъ историко-юридическихъ сведеній, относящихся до России, издаваемый Николаем Калачовымъ. – Кн. 1. – М.: Тип. А. Семена, 1850. – 55 с.

2. Исторические судьбы христианства и современность. Материалы междунар. конф., 19-20 октября 1999 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина. – Брест, 2000. – 164 с.

3. Рыбаков, Б. А. Языческое мировоззрение русского средневековья / Б. А. Рыбаков // Вопросы истории. – 1974. – №1. – С. 3–30.

4. Филист, Г. М. Введение христианства на Руси: предпосылки, обстоятельства, последствия / Г. М. Филист. – Минск: Беларусь, 1988. – 254 с.

5. Нравственное состояние русского общества въ XVI века, по сочинениям Максима Грека и современнымъ ему памятникъ. – М.: Тип. Э. Лисснеръ и Ю. Романъ, 1881. – 252 с.

6. Замалеев, А. Ф. Восточнославянские мыслители: эпоха Средневековья / А. Ф. Замалеев. – СПб.: Изд-во С.-Петербурского ун-та, 1998. – 270 с.

7. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск: НКФ «Экаперспектыва», 1996. – 453 с.

8. Ганецкая, І. У. Беларуская культура XI–XIII стст. у агульнаеўрапейскім кантэксте / І. У. Ганецкая // Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе XX стагоддзя / уклад.: В. К. Шчэрбін, Г. М. Зенава, Л. М. Марчанка. – Мінск, 1998. – С. 366–369.

9. Идеи эстетического воспитания: антология: в 2-х т. – М.: Искусство, 1973. – Т. I. – 408 с.

10. Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии. – Минск: Наука и техника, 1977. – 280 с.

11. Майхрович, А. С. Становление нравственного сознания: из истории духовной культуры Беларуси / А. С. Майхрович. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1997. – 206 с.

12. Евангелие. – Тяпино?: Изд. Василия Тяпинского, 70-ые годы XVI в. – более 126 с.

13. Майоров, Г. Г. Этика в средние века / Г. Г. Майоров – М.: Знание, 1986. – 64 с.

14. Климан, Оливье. Вопросы о человеке / Оливье Климан // Русское зарубежье в год тысячелетия крещения Руси. – М.: Столица, 1991. – 161 с.

15. Гельвеций, К. А. Сочинения в 2-х томах / К. А. Гельвеций. – М.: Мысль, 1973–1974 гг. – Т. 1–2. – 687 с.

16. Менталитет восточных славян: история, современность, перспективы: Материалы междунар. научн. конф., 27-28 октября 1999 г. / под. ред. к. с. н., доцента В. В. Кириенко – Гомель: ГГУ им. П. О. Сухого, 1999. – 220 с.

17. Беларусіка / пад рэд. А. Анціпенка. – Мінск: Нац. навук. -асветны цэнтр імя Ф. Скарыны, 1993. – Кн. 2. – 403 с.

18. Zebrowski, S. Recepta na plastr Czechowica / S. Zebrowski. – Kraków, 1597. – 140 s.

19. Мамед-Заде, И. Р. Из истории социально-этических учений эпохи Возрождения / И. Р. Мамед-Заде // Известия АН Азерб. ССР. – Серия 3. – 1984. – № 3. – С. 86–91

20. Подокшин, С. А. Проблема восточноевропейского ренессансного гуманизма / С. А. Подокшин // Иван Федоров и восточнославянское книгопечатание. – Минск: Наука и техника, 1984. – С. 30–50.

Мазырскі дзяржаўны педагагічны
універсітэт імя І. П. Шамякіна

Поступило 26. 01. 10